*УДК 821.161.3-1*
**Таццяна Пятроўна Барысюк**, навуковы супрацоўнік
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь
*эл. пошта*: pit06po@gmail.com

**Tatsiana Piatrouna Barysiuk**, Researcher
Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus
*e-mail*: pit06po@gmail.com

# ГІБРЫДНЫЯ ЖАНРЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

У тэзісах аналізуюцца гібрыдныя жанры ў сучаснай беларускай паэзіі, пры стварэнні якіх узаемадзейнічаюць цвёрдыя формы і віды верша, а таксама іншадысцыплінарныя жанры – са сфер навукі, рыторыкі, фальклору, кінамастацтва і жывапісу.
*Ключавыя словы*: гібрыдныя жанры, іншадысцыплінарныя жанры, жанравы сінтэз

# HYBRID GENRES IN MODERN BELARUSIAN POETRY

Theses analyze hybrid genres in modern Belarusian poetry, in the creation of which solid forms and types of verse interact, as well as interdisciplinary genres – from the spheres of science, rhetoric, folklore, cinematography and painting.
*Key words*: hybrid genres, interdisciplinary genres, genre synthesis

Матэрыял: творы сучаснай беларускай паэзіі.

Метады даследавання: жанравы аналіз, аналіз тыпалагічных сыходжанняў.

Далейшыя перспектывы даследавання: вывучэнне найбольш часта выкарыстоўваемых заходніх і ўсходніх жанраў у сучаснай беларускай паэзіі, у тым ліку твораў з прыкладамі жанравай гібрыдызацыі, таксама і міждысцыплінарнай: з выкарыстаннем жанраў маўленчых, навуковых, фальклорных, жывапісных, з кінамастацтва і інш.

Мэта нашай працы – разгледзець такую заканамерную і папулярную з’яву, як жанравая гібрыдызацыя, – як праяўленне інавацыйных пошукаў у сучасных беларускіх паэтаў. З фізікі мы помнім, што няма чыстых рэчываў

у прыродзе, але жанравы сінтэз (г.зн. жанравая дыфузія) у паэзіі – гэта свядомая творчая дзейнасць паэтаў па стварэнні вершаў з дзвюх або болей жанравых форм. У некаторых сучасных паэтаў (С. Мінскевіча і В. Жыбуля) зварот да гібрыдных форм можа быць патлумачаны эстэтыкай постмадэрнізму, з яго калажнасцю і неабходнасцю гульні са словам.

Прыкладамі фармальна-сінтэтычнага наватарства можна назваць "Акрасанет" (акраверш+санет), "Акрамадрыгал" (акраверш+мадрыгал), "Акраліст" (акраверш+ліст) і "Акранавагодняе" (акраверш + віншаванне) Рыгора Барадуліна, "Рок-санет" Алеся Звонака, "Паводле прароцтва" (акратэлеверш фігурны) Анатоля Кудласевіча, газелі-туюгі, лімэрыкі-туюгі, "І шал і сум і бур" ("скразны санет з аплікацыяй, двайной газеллю і чатырма залюстраванымі туюгамі"), "Дождж од" (танка-паліндром), "Космас" (хайку-паліндром) Сержа Мінскевіча, "Эпікурэйства" (санет-газель-туюг) і "Шчадрыца" (санет-брахікалан) Юрася Пацюпы, "Вяртанне" (паэма-трыялет) Генадзя Аўласенкі, хоку-паэма Аксаны Спрынчан, паліндрамічная паэма "Рогі гор" Віктара Жыбуля, "Трыялет" – пародыя на радкі Сержука Сокалава-Воюша і "Лічылка" – пародыя на радкі Нэлі Тулупавай Анатоля Зэкава, "Вянок парадыйных санетаў" (вянок санетаў + пародыі-прысвячэнні розным аўтарам, дзе мадрыгалам з'яўляецца аўтапародыя) Міхася Пазнякова, "Парадыйная балада" (пародыя на балады В. Шніпа) Юрася Нератка, "Элегічны рытурнель-манарым" Міколы Віняцкага, "Акраліст" (акраверш+ліст), "Акраэлегія" (акраверш+элегія) Таццяны Барысюк і інш. Як бачым, у працэсы жанравай гібрыдызацыі ўключаюцца і цвёрдыя формы, і віды верша. У сінтэтычных жанравых формах мы заўважылі наступную заканамернасць. Чым больш кампанентаў – жанраў у складзе сінтэтычнага мастацкага твора, тым цяжэй кожнаму са складнікаў захоўваць сваё жанравае аблічча. Тады ў складзе сінтэтычнага цэлага цвёрдыя формы і віды верша "ідуць на кампраміс" і "ахвяруюць" некаторымі сваімі ўласцівасцямі. Такія складанасці адбываюцца пры цяжкасцях фармальна-структурных супадзенняў жанраў.

Наватарскім можна лічыць і перанос жанраў з іншых відаў мастацтва і сфер дзейнасці ў паэзію як праяву міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння. І гэты іншадысцыплінарны складнік уступае ў сінтэтычнае ўзаемадзеянне з іншымі формамі. Так, напрыклад, з маўленчых жанраў у паэзію прыйшлі віншаванні і зычэнні, якія ў пары з формай акраверша нарадзілі наступныя творы: "Акранавагодняе" (акраверш + віншаванне), "Vivat!" (Акразычэнне), "Акравітаньне", "Акрачалом праз акіян" (акраверш + вітанне) Р. Барадуліна. Перанос жанра навуковага даследавання кшталту манаграфіі ў паэзію нарадзіў "Эпіграму на паэтаў" (эпіграма+навуковае даследаванне кшталту даклада на канферэнцыі) Т. Барысюк. Перанос у паэзію фальклорнага жанру кленічаў і калыханкі як складнікаў сінтэтычнага цэлага спарадзіў "Акрапраклён" (акраверш+кленічы) і "Спі, мой цар…" (калыханка+брахікалан) Т. Барысюк. Запазычаннем са сфер кінамастацтва і жывапісу і ўвасабленнем іх сінтэтычнага адзінства выглядае "Дыяфільм пра мора" (вершы-кадрыкі) Міколы Маляўкі ("Прыбой", "Буёк", "Матылёк", "Каменьчыкі-праменьчыкі" і інш.) (дыяфільм+марына як жанр выяўленчага мастацтва). Сінтэз жанра аўтапартрэта з жывапісу і санета мы бачым у вершы "Асенняя кветка" (аўтапартрэт+санет) Т. Барысюк.

Такім чынам, у сучаснай беларускай паэзіі мы можам назіраць прыклады заканамернага сінтэтычнага наватарства, пры якім узаемадзейнічаюць як цвёрдыя формы, так і віды верша і пры якім часам адным/двума складнікам/складнікамі з'яўляюцца жанры, перанесеныя з іншых відаў мастацтва ў паэзію. У першым выпадку мы заўважылі закон жанравага ахвяравання ў выпадку складанасцей утварэння сінтэзу з-за немагчымасці ідэальных фармальна-структурных супадзенняў. Прычына з'яўлення некаторых гібрыдных жанраў у сучаснай беларускай паэзіі – постмадэрнісцкая арыентацыя іх аўтараў на калажнасць і гульню са словам.